*В.А.Какшынская*

# САЦЫЯЛЬНАЯ РОЛЯ БІБЛІЯТЭКІ Ў СІСТЭМЕ ЭКАЛАГІЧНАГА ВЫХАВАННЯ ПАДЛЕТКАЎ

Сучасны этап грамадскага развіцця характарызуецца пагаршэннем экалагічнага стану як у сусветным, так і ў нацыянальным маштабе. Прычынамі гэтага з’яўляюцца безадказныя адносіны да прыроды, да асваення яе рэсурсаў. Галоўнай экалагічнай праблемай для Беларусі стала чарнобыльская катастрофа, у выніку чаго абмежаваны магчымасці эканамічнага развіцця краіны, назіраецца пагаршэнне здароўя і ўмоў пражывання насельніцтва.

Актуальнасць экалагічнага выхавання абумоўлена перш за ўсё недастатковай сфарміраванасцю экалагічнай свядомасці і паводзін грамадзян, у тым ліку дзяцей і падлеткаў. Менавіта таму ўдасканаленне работы ў галіне экалагічнай асветы, адукацыі і выхавання з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў дзяржаўнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Вышэйадзначаныя абставіны прыводзяць да павелічэння запатрабаванасці ў экалагічнай інфармацыі, валоданне якой мае першараднае значэнне для забеспячэння рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Экалагічная інфармацыя фарміруецца з дапамогай шматлікіх і разнастайных арганізацый. Гэта заканадаўчыя, выканаўчыя органы ўлады, якія выдаюць розныя нарматыўныя акты, прымаюць планы і праграмы. Гэта службы адпаведных міністэрстваў і ведамстваў, якія сочаць за станам навакольнага асяроддзя, за фактарамі ўздзеяння на яго, а таксама за здароўем людзей. Гэта шматлікія навукова-даследчыя арганізацыі – інстытуты, станцыі і інш. Крыніцамі інфармацыі могуць быць камерцыйныя арганізацыі, напрыклад, тыя, якія выконваюць замярэнні характарыстык навакольнага асяроддзя, і інш. Грамадскія арганізацыі, якія з’яўляюцца карыстальнікамі інфармацыі, у той жа час ажыццяўляюць яе збор і распаўсюджванне. Вялікую інфармацыйную работу ажыццяўляюць інфармацыйныя цэнтры. Каардынуюць дзейнасць па ахове навакольнага асяроддзя міжнародныя арганізацыі [3].

У сістэму экалагічнага выхавання ўваходзяць і бібліятэкі, якія выкарыстоўваюць увесь свой інфармацыйны патэнцыял па забеспячэнні экалагічнай праблематыкі. Больш таго, бібліятэкі з’яўляюцца амаль адзінымі ўстановамі культуры, на якія кладзецца абавязак пошуку, збору, апрацоўкі, захоўвання і распаўсюджвання

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

экалагічнай інфармацыі. Трэба адзначыць, што бібліятэка – гэта ў першую чаргу сацыяльная інфармацыйная ўстанова. Ні адна структура грамадства не насычана такім аб’ёмам інфармацыйных рэсурсаў, як бібліятэка; да таго ж у бібліятэцы інфармацыя агульнадаступная, якасна апрацаваная і сістэматызаваная. Не выпадкова бібліятэкі становяцца найбольш цікавымі аб’ектамі па накапленні і канцэнтрацыі экалагічнай інфармацыі [7].

З мэтай аптымізацыі работы па стварэнні цэласнай сістэмы экалагічнай асветы насельніцтва, кансалідацыі намаганняў арганізацый і ўстаноў, якія займаюцца пытаннямі аховы навакольнага асяроддзя, а таксама прыцягнення дадатковых крыніц інфармацыі і фінансавання бібліятэк на сучасным этапе навукова-даследчым аддзелам бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі распрацоўваецца Рэспубліканская мэтавая праграма па экалагічнай асвеце і інфармаванні насельніцтва ва ўмовах бібліятэкі. Праграма дазволіць павысіць узровень экалагічнай культуры насельніцтва, аказаць уплыў на развіццё і ўкараненне прыродаахоўных тэхналогій, што ў сваю чаргу будзе садзейнічаць стабілізацыі працэсаў матэрыяльнага і духоўнага жыцця грамадства. Паводле рашэння Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь раз у два гады ў рэспубліцы праводзіцца конкурс дзейнасці бібліятэк па праблемах экалагічнай адукацыі і інфармацыі насельніцтва. Неабходна адзначыць, што Палажэнне аб конкурсе зарэгістравана ў Нацыянальным рэестры прававых актаў Рэспублікі Беларусь, што падкрэслівае сацыяльную значнасць бібліятэкі ў экалагічным інфармаванні.

Асаблівая ўвага бібліятэк скіравана на экалагічнае выхаванне падлеткаў, на засваенне падрастаючым пакаленнем сістэматызаваных ведаў аб узаемадзеянні грамадства і прыроды, фарміраванне практычных уменняў і навыкаў рацыянальнага выкарыстання і аховы прыроды. Пры абслугоўванні падлеткаў бібліятэкі ўлічваюць іх псіхаэмацыйныя, узроставыя асаблівасці, іх чытацкія перавагі [4].

Бібліятэкі цесна супрацоўнічаюць з установамі пазашкольнага выхавання і адукацыі, а менавіта з экалагічнымі цэнтрамі, экалагічнымі клубамі, навуковымі экалагічнымі таварыствамі навучэнцаў, гурткамі юнатаў. Іх дзейнасць каардынуе Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва, з якім бібліятэкі трымаюць цесныя сувязі. Яны таксама супрацоўнічаюць з дзяржаўнымі органамі і ведамствамі, грамадскімі аб’яднаннямі, міжнароднымі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

арганізацыямі і фондамі, забяспечваюць сваімі фондамі дзейнасць шматлікіх гурткоў і студый экалагічнай накіраванасці [3].

Патрэбна адзначыць і той факт, што бібліятэкі здзяйсняюць экалагічнае выхаванне у цеснай сувязі з экалагічнай асветай і адукацыяй. Эфектыўнасць дзейнасці бібліятэкі як сацыяльнай установы павінна вызначацца пры выкананні пэўных умоў. Сярод іх можна вылучыць наступныя:

– цеснае супрацоўніцтва бібліятэкі з іншымі сацыяльнымі структурамі грамадства (сям'ёй, школай, навукай, органамі кіравання, сродкамі масавай інфармацыі і інш.);

– мэтанакіраванае фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў па экалагічных праблемах і раскрыццё іх у прывабных для падлеткаў формах;

– сістэмнасць у вывучэнні і развіцці чытацкіх патрэб падлеткаў шляхам удасканалення методыкі абслугоўвання і выкарыстання інавацыйных тэхналогій;

– дыягностыка экалагічнай культуры падлеткаў;

зацікаўленасць асобы бібліятэкара ў экалагічным выхаванні карыстальнікаў.

Такім чынам, бібліятэка як сацыяльны інстытут са сваім універсальным фондам і інавацыйнымі тэхналогіямі з'яўляецца адным з найбольш дзейсных звёнаў экалагічнага выхавання, экалагічнай асветы, экалагічнай культуры падлеткаў.

---

*1. Дзейнасць* установ культуры па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі: манаграфія / А.І.Смолік, У.А.Мамонька, А.Р.Маісеенка і інш.; пад рэд. А.І.Смоліка. – Мн.: Бел. ун-т культуры, 1999. – 160 с.

*2. Дзямешка, Л.А.* Сацыяльна-педагагічныя тэхналогіі ў дзейнасці дзіцячай бібліятэкі / Л.А.Дзямешка // Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі і сацыяльная значнасць бібліятэк: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. – Мн., 2004. – С. 50–53.

*3. Какшинская, О.А.* Библиотека в системе распространения экологических знаний среди подростков: подходы к решению проблемы / О.А.Какшинская // Вестник молодежного научного общества. – 2004. – № 2. – С. 59–62.

*4. Какшинская, О.А.* Подросток – читатель библиотеки как объект экологического воспитания / О.А.Какшинская // Вестник молодежного научного общества. – 2004. – № 3. – С. 36–38.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Национальная* стратегия устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Национальная комиссия по устойчивому развитию Республики Беларусь; редкол.: Я.М.Александрович [и др.] – Мн.: Юнипак, 2005. – 200 с.

6. *Фарино, К.С.* Система экологического образования и воспитания в Республике Беларусь / К.С.Фарино // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 1. – С. 6–10.

7. *Экологическая* информация и принципы работы с ней / Т.В.Гусева и др.; под ред. В.Н.Виниченко. – М.: Социально-экологический союз, 1998. – 244 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ